**Этнакультурная адукацыя дзяцей дашкольнага ўзросту**

Фарміраванне ў дашкольнікаў нацыянальнай самасвядомасці непасрэдна звязана з працэсам этнакультурнай самаідэнтыфікацыі асобы. У сувязі з гэтым адным з вызначальных накірункаў дашкольнай адукацыі выступае этнакультурная адукацыя дашкольнікаў.

Паколькі адукацыя – гэта працэс перадачы назапашаных пакаленнямі ведаў і культурных каштоўнасцей, а этналогія вывучае народы-этнасы, іх паходжанне, заканамернасці развіцця, характар жыццядзейнасці, культурныя традыцыі і міжэтнічныя ўзаемасувязі, то ў пэўнай ступені вырашэнню дадзенай праблемы будзе спрыяць распрацоўка працэсуальнага кампаненту этнакультурнага выхавання і развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту. Пры гэтым асаблівае значэнне набывае не аб'ём ведаў, а прадуктыўная іх інтэрпрэтацыя.

Этнакультурнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца сістэмаўтвараючым звяном адукацыйнага працэсу. Яно заарыентавана на фарміраванне сістэмнай ідэнтыфікацыі і фарміраванне інтэрыярызацыі этнакультурных і агульначалавечых каштоўнасцей.

Па зазначэнні Л. І. Бажовіч, Л. С. Выгоцкага, А. М. Лявонцьева, С. Л. Рубінштэйна, Д. Б. Эльконіна і інш., актыўная ствараючая дзейнасць з'яўляецца асноватворнай у засваенні асобай этнакультуры як агульнай часткі агульначалавечай культуры, што перадаецца ў матэрыяльных і духоўных каштоўнасцях.

Адзначым, што ўключэнне дашкольніка ў выхаваўча-адукацыйны працэс разглядаецца як яго жыццё ў соцыякультурным акружэнні.

Што да ідэнтыфікацыі дашкольнікаў у этнакультурным асяроддзі і авалодвання імі агульначалавечымі каштоўнасцямі, то гэты працэс у першую чаргу ажыццяўляецца пры ўмове авалодання імі роднай ( беларускай) мовай.

Па меркаванні айчынных педагогаў А. А. Грымаця, Н. С. Старжынскай, А. Ю. Лозкі, узмацненню этнізацыі адукацыі спрыяе павялічэнне ролі роднай мовы, прытрымліванне ў выхаванні мэтаў народнай педагогікі.

Узаемасувязь і узаемаабумоўленасць культуры і роднай мовы звязана з тым, што на роднай мове ажыццяўляецца першапачатковае індывідуальнае і сацыяльнае развіццё дзіцяці, фарміраванне яго асобы. Родная мова дапамагае дзіцяці ўвайсці ў навакольны свет, стаць сапраўдным грамадзянінам пэўнай культурнай прасторы. Вывучэнне мовы як сродка зносін узаемазвязана з адначасовым вывучэннем культуры таго народа, які ажыццяўляе зносіны на гэтай мове.

У нашай краіне распрацавана дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў. У ёй падкрэсліваецца неабходнасць забяспячэння абавязковага, паслядоўнага ўкаранення беларускай мовы ў выхаваўча-адукацыйны працэс як беларускамоўных дашкольных устаноў, так і дашкольных устаноў з рускім моўным рэжымам. Асаблівае значэнне такі напрамак работы набывае ў сувязі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тым, што навучанне беларускай мове ў рэспубліцы ажыццяўляецца ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі, якую можна ахарактарызаваць як руска-беларускае блізкароднаснае двухмоўе, дзе беларуская мова толькі пачынае займаць месца роднай мовы і цалкам становіцца не толькі мовай памяці і этнічнай ідэнтыфікацыі, а на самой справе мовай душы.

Беларуская мова вызначае сабой адначасова і змест, і сродкі духоўнага развіцця дзіцяці, яго дачынення да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

Авалоданне багаццем беларускай мовы у розных тыпах дашкольных устаноў складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці як прадстаўніка пэўнага этнасу, спрыяе яе этнакультурнаму выхаванню. Аднначасова з засваеннем мовы вядзецца работа па азнаямленні дзяцей з духоўнымі і матэрыяльнымі каштоўнасцямі нацыянальнай культуры.

Разам з тым этнакультурнае выхаванне ў дашкольным дзяцінстве трэба ажыццяўляць як на традыцыях айчыннай народнай культуры , так і улічваючы міжэтнічныя ўзаемасувязі. Пры гэтым культурацэнтрыстская парадыгма будуецца на прынцыпе адзінства і ўзаемадзеяння беларускага і агульнасусветнага.

У сувязі з гэтым асноўнымі задачамі этнакультурнай адукацыі дашкольнікаў выступаюць: абуджэнне ў дзетак цікавасці да багацейшай нацыянальнай фальклорнай спадчыны, да духоўнай культуры беларускага народа; пашырэнне уяўленняў старшых дашкольнікаў пра адлюстраваную ў фальклоры духоўную і матэрыяльную культуру беларусаў; арыентацыя дашкольнікаў на традыцыйныя духоўныя каштоўнасці, дзе вызначаючым з’яўляецца суаднесенне і ўзаемадзеянне агульначалавечага і этнакультурнага; выхаванне кожнага дзіцяці ў разуменні даверу, узаемадапамогі, сяброўства паміж народамі; фарміраванне ў дашкольнікаў свядомасці таго, што іх здольнасці прысвечаны служэнню на карысць іншым людзям, свайму народу; выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту патрыятызму, гонару за свой народ і яго багатую культуру.

Сярод вызначальных сродкаў этнакультурнай адукацыі дашкольнікаў разам з беларускамоўнымі зносінамі выступаюць прадметы быта і народнай творчасці, родная прырода, народная архітэктура.

Узбагачэнню ўяўленняў дзяцей пра беларускую культуру спрыяе іх сістэматычнае, паслядоўнае знаёмства з традыцыямі, звычаямі, абрадамі беларускага народа; нормамі паводзін і этыкету; адметнасцю побыту; народнага касцюма; музыкальнымі інструментамі, народнымі святамі.

Этнакультурная адукацыя дзяцей у дашкольнай установе непасрэдна звязана з культурна-каштоўнаснымі, асобасна-развіваючымі састаўляючымі акружаючага асяроддзя; са стварэннем жыццёвай пrasторы дашкольніка, у якой усё накіравана на арганізацыю этнакультурнага выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўным сродкам арганізацыі гэтага працэсу з’яўляецца вусная паэтычная творчасць . Менавіта яна выступае захавальнікам багацейшых духоўных традыцый , побыту і гаспадарчага вопыту беларускага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ